*Ірына Гоўзіч*
*(Мінск)*

# ТВОРЧАСЦЬ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА Ў КАНТЭКСЦЕ ЛІТАРАТУРЫ «ПЛЫНІ СВЯДОМАСЦІ»

Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя развівалася паскорана, спасцігаючы і «наслойваючы» на раней выпрацаваныя традыцыі новыя павевы еўрапейскага слоўнага мастацтва, звязаныя з мадэрнізмам і авангардызмам. На глебу традыцыйнага рэалістычнага перасатварэння аб'ектыўнага быцця ў іншабыццё ў слове «наслойвалася» суб'ектыўнае імкненне мастака стварыць часткова ці поўнасцю непадобны да вонкавай рэчаіснасці іншасвет.

Вядучым творчым прынцыпам у гэты перыяд становіцца мадэрнізм – мастацка-эстэтычная сістэма, светапоглядны падмурак якой складаюць метафізічны ідэалізм, філасофія жыцця, экзістэнцыялізм, у якой вызначальным з'яўляецца эстэтычны крытэрый ацэнкі рэчаіснасці. Жыццё / быццё вымяраецца мастаком не толькі катэгорыямі дабра і зла, а і катэгорыямі прыгожага і пачварнага (гармоніі і хаосу). Паэтыка твораў мадэрнісцкай літаратуры грунтуецца на выяўленні падкрэсленай суб'ектыўнасці індывідуальнага светабачання, пісьменнікаў, філосафаў, творцаў прыгожага ў выяўленчым мастацтве цікавіць найперш сфера свядомага і несвядомага/падсвядомага/трансцэндэнтнага. Менавіта праз сферу свядомага і несвядомага паўстае ў іх творчасці спрадвечна аб'ектыўны свет. У сувязі з адкрыццямі псіхааналізу паглыбляюцца ўяўленні пра псіхалагічную структуру чалавечай асобы, што і адлюстроўвае мадэрнісцкая літаратура.

Дамінантным прынцыпам стварэння вобразу героя становіцца «плынь свядомасці» (*stream of consciousness*) – прыём у літаратуры XX стагоддзя пераважна мадэрнісцкага кірунку, які непасрэдна выяўляе душэўнае жыццё, перажыванні, асацыяцыі чалавека.

Нягледзячы на тое, што тэрмін «плынь свядомасці» належыць амерыканскаму філосафу-ідэалісту Уільяму Джэймсу, які сцвярджаў, што свядомасць – гэта струмень, рака, у якой думкі, перажыванні, успаміны, раптоўныя асацыяцыі ўзаемаперапыняюцца і «нелагічна» пераплятаюцца («Навуковыя асновы псіхалогіі», 1980), імкненне да аналізу ўнутранага жыцця чалавека з дапамогай яго непасрэднага адлюстравання заўважаецца ў літаратуры яшчэ з даўніх часоў («Гутарка душы самой з сабой» Платона). Значна апярэдзіў літаратурны працэс свайго перыяду Л. Стэрн, які зрабіў цэнтрам свайго твора «Жыццё і меркаванні Трыстама Шэндзі» (1767) пачуцці, перажыванні і думкі галоўнага героя. Далейшае развіццё літаратуры «плыні свядомасці» звязана з творчасцю Стэндаля, А. Дзюма, Т. Гацье ў еўрапейскім слоўным мастацтве і Л. Тапстога ў рускай і інш.

Новае развіццё і абгрунтаванне ідэя «плыні свядомасці» атрымала ў працах З. Фрэйда, а затым К. Юнга. Класічнымі прадстаўнікамі школы «плыні свядомасці» лічацца англійскі пісьменнік Д. Джойс («Уліс», 1922), У. Фолкнер і Г. Стайн (ЗША), В. Вулф (Англія), М. Пруст (Францыя).

З дапамогай выкарыстання «плыні свядомасці» ствараецца ўражанне, што чытач нібы «падслухоўвае» суб'ектыўны свет персанажаў, што дае яму інтымны доступ у іх думкі, што асягаецца двума шляхамі – апавяданнем / цытаваннем і ўнутраным маналогам. Наратыўны, апавядальны спосаб перадачы «плыні свядомасці» пераважна складаецца з рознага тыпу сказаў (простай мовы героя і ўскоснай аўтара), якія апісваюць эмацыйна-псіхалагічны стан героя, унутраны ж маналог з'яўляецца прамым цытаваннем думак героя.

Варта таксама зазначыць, што пошукі беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя былі арганічна знітаваны не толькі з еўрапейскімі стылямі, плынямі і кірункамі, але і з рускімі. Руская літаратура ў канцы XIX і першых двух дзесяцігоддзях XX стагоддзя перажывала росквіт фармальна-змястоўных пошукаў, прайшла па значнасці набыткаў цэлую эпоху Сярэбранага веку, выявіла сябе ў межах разнастайных мадэрнісцкіх плыняў, кожная з якіх была прадстаўлена яскравай знакавай пастаццю: М. Гумілёў – акмеізм, С. Ясенін – імажынізм, А. Белы – сімвалізм, А. Кручоных – футурызм і г. д. Беларуская літаратура не вылучыла падобных знакавых постацяў, хоць і зазнала, што такое мадэрнізм, дакранулася да пошукаў новых (суб'ектывізаваных у большай ступені, чым пры рэалістычнай вобразатворчасці) прыёмаў пісьма. Будзем мець на ўвазе, што нацыянальная літаратура, у адрозненне ад рускай, не стварыла паўнакроўнай мадэрнісцкай канцэпцыі быцця, не ідэнтыфікавалася ў асобных плынях новага мастацкага напрамку, але ў баку ад агульнаеўрапейскага працэсу «надточвання», «нарошчвання» рэалізму адметнымі прынцыпамі пераўвасаблення рэчаіснаснасці ў вобразны свет не засталася.

Максім Гарэцкі – адметная постаць у літаратурным працэсе першай трэці XX стагоддзя, як і Янка Купала, Якуб Колас («Казкі жыцця», «Сымон-музыка»), Змітрок Бядуля, Алесь Гарун, Цётка («Зялёнка» і іншыя апавяданні), адметна, па-свойму арыгінальна і непаўторна, пераадольваў (у лепшым значэнні гэтага слова) рэалізм. Засвоіўшы традыцыі фальклору, беларускай (Ф. Багушэвіч, М. Багдановіч) і рускай (Л. Талстой, Ф. Дастаеўскі, А.П. Чэхаў) класікі, ён дапаўняў свае набыткі эксперыментальнымі пошукамі. Вынікам падобнага падыходу да мастацкай творчасці становіцца агульны стылявы рух прозы пісьменніка: ад рэалістычных апавяданняў, абразкоў, аповесцей з адчувальнымі прыкметамі бытавізму, дакументалізму і разам з тым мадэрнізму ў аспекце выкарыстання адзнак літаратуры «плыні свядомасці» («У лазні», «Роднае карэнне», «Ціхая плынь» і інш.) да лірыка-філасофскай прозы («Дзве душы»), да мадэрнісцкай аповесці («Меланхолія») і, нарэшце, да сімвалісцкай (нават постмадэрнісцкай) творчасці з выразнымі адзнакамі экзістэнцыялізму («Скарбы жыцця», «Лявоніус Задумекус»).

Выяўленне адзнак «плыні свядомасці» ў творчасці М. Гарэцкага супадала са зваротам мастацкай літаратуры да выяўлення падсвядомага. У апавяданнях (зборнік «Рунь»), аповесцях («Меланхолія»), раманах-хроніках («Віленскія камунары») знаходзіць адлюстраванне новая форма пісьма, у якой рухомыя, ледзь улоўныя настроі і адчуванні складаюць аснову пісьменніцкага аповеду, а дзеянне часта пераносіцца ва ўнутраную сферу. Лявон Задума не толькі і не столь-

кі «ўпісваецца»ў сялянскае жыццё-быццё, колькі рэфлексуе з нагоды ўбачанага.

М. Гарэцкага як мастака слова паступова цікавяць не столькі самі падзеі, колькі іх адбітак у свядомасці і псіхалогіі герояў, з'яўляецца новы тып аўтарскага псіхалагізму – непасрэднае выяўленне працэсу думак, разважанняў, пачуццяў, фіксацыя асобных момантаў душэўнага стану, злучэнне аддаленых у часе ўспамінаў, спалучэнне лірычнага і эпічнага спосабаў адлюстравання быцця: «Людзі ідуць за народ на смерць, сядзяць у турмах, пакутуюць у Сібіры, усімі сіламі падкопваюць той гнёт, які прыдушыў нас. А я? Што я раблю? Чым я, паглядзеўшы на мяне збоку, чым я лепшы за гэтых паняў, якія праехалі міма мяне, сумныя, чорныя, надзьмутыя?» [1, с. 53].

Самакаштоўным прадметам мастацкага выяўлення ў М. Гарэцкага становяцца ўнутраныя перажыванні асобы, а не падзеі навакольнага жыцця, а дамінантай/асновай у стварэнні вобраза выступае самасвядомасць героя. Так, у аповесці «Меланхолія» апавядаецца найперш не пра знешнія падзеі ў жыцці галоўнага героя Лявона Задумы, а адлюстроўваецца яго ўнутраны свет – думкі, пачуцці і перажыванні з дапамогай як лістоў да сябра (цыкл «Сумныя лісты»), так і ўнутраных маналогаў. Самараскрыццё героя, яго выяўленне ў натуральнасці плыні думак і пачуццяў дасягае ў творы апагею.

Творы Максіма Гарэцкага сінкрэтычныя, спалучаюць у сабе адзнакі рэалізму, мадэрнізму (выкарыстанне прыёмаў «плыні свядомасці», адзнак сімвалізму) і нават постмадэрнізму (да прыкладу, аповесць «Меланхолія» мае рызомны характар), з'яўляючыся на рэальнай глебе мастацкія палотны пісьменніка, прарастаюць зернямі нейкага новага, ужо не просталінейнага, а фантазійна-мройнага мыслення. Гэта творы, у якіх побач з праўдай існуе вымысел, малы час мяжуецца з часам вялікім, героі робяцца шматаблічнымі па волі мастака, перасатвараюцца ў сімвалы, набываюць адзнакі абагуленасці, як у міфах. У яго наватвораным мастацкім свеце апошніх гадоў пануюць цемра, хаос, правяць баль змрочныя сілы зла, а чалавек застаецца каштоўнасцю ў сабе, часта адзінокай, ды нязломнай. Максім Гарэцкі, бясспрэчна, прытчападобны, іншаска-зальны. Апошнія творы пісьменніка – аповед пра людзей, што страцілі гумані-стычныя арыенціры і кіруюцца не на Патмос (востраў спакою і шчасця), а у Нішто, у Бездань, у Змрок. Канцэпцыя рэчаіснасці ў апошніх творах Максіма Гарэцкага заключае ў сабе магутныя элементы фантазійнасці, выразнага перасатварэння рэальнасці, спалучае парадаксальнае, заканамернае і выпадковае, асэнсаванае і бессэнсоўнае і тым самым набліжаецца да мадэрнісцкіх і постмадэрнісцкіх пошукаў новага зместу, новых ідэалаў, новых прыёмаў мастацкага пісьма.

Літаратура

1. Гарэцкі М. Меланхолія / М. Гарэцкі // Выбраныя творы ў 2 т. Т. 2. Аповесці, дакументальна-мастацкія запіскі, раман. – Мінск: Маст. літ., 1973. – С. 5–64.